**Выбары дэпутатаў**
**Палаты прадстаўнікоў Нацыяльнага сходу**
**Рэспублікі Беларусь сёмага склікання**

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання: 28 кастрычніка – 2 лістапада**

*Назіранне за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца РПГА "Беларускі Хельсінкскі Камітэт" і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары".*

## ВЫСНОВЫ

- Зафіксаваныя факты адмоў у публікацыі перадвыбарчых праграм і трансляцыі выступленняў кандыдатаў у дэпутаты. Афіцыйнай прычынай, як правіла, указваюцца "прыкметы парушэння артыкула 47 Выбарчага кодэкса". На думку экспертаў кампаніі, змест гэтага артыкула трактуецца выбарчымі камісіямі празмерна шырока, што вядзе да абмежавання свабоды перадвыбарчага выступу кандыдата ў дэпутаты і носіць характар цэнзуры.
- Адзначаюцца выпадкі выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу ў мэтах правядзення праўладнымі кандыдатамі перадвыбарчай агітацыі, а таксама факты стварэння перашкодаў для незалежных і апазіцыйных кандыдатаў у правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў.
- Найбольш актыўна асвятляюць выбарчую кампанію незалежныя медыя, якія даюць матэрыялы пра характар правядзення пікетаў, заўвагі і скасаванні рэгістрацыі апазіцыйных кандыдатаў, паведамляюць пра зняцце выступаў з эфіру. Дзяржаўныя СМІ абмяжоўваюцца пераважна афіцыйнай інфармацыяй.
- Мясцовымі выканкамамі не выконваецца ў поўнай меры патрабаванне ЦВК аб размяшчэнні на адпаведных Інтэрнэт-старонках, прысвечаных выбарчай кампаніі, інфармацыі аб выдаткаванні сродкаў са спецыяльных выбарчых рахункаў кандыдатаў у дэпутаты.

## АГІТАЦЫЙНАЯ КАМПАНІЯ

Назіральнікі фіксуюць факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу ў мэтах правядзення праўладнымі кандыдатамі перадвыбарчай агітацыі, а таксама факты перашкодаў для незалежных і апазіцыйных кандыдатаў.

30 кастрычніка ў СШ № 8 Слоніма замест абвешчанага агульнашкольнага бацькоўскага сходу ідэалагічны аддзел Слонімскага райвыканкама праводзіў сустрэчу з кандыдатам па Слонімскай ВА № 58 Валянцінам Семяняка. Праўладны кандыдат у дэпутаты па Смаргонскай ВА № 59, намеснік старшыні Астравецкага райвыканкама Віктар Свіла праводзіў сустрэчы ў смаргонскіх школах № 1 і 7 у час, калі павінны былі ісці школьныя заняткі.

1 лістапада з 11:00 да 13:00 у будынку Докшыцкага райвыканкама кандыдат у дэпутаты па Докшыцкай ВА № 22, дзеючы дэпутат і спікер Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка праводзіў прыём грамадзянаў.

31 кастрычніка на сустрэчы кандыдата ў дэпутаты па Гродзенскай-Занёманскай ВА № 49 Ірыны Луканскай, якая з'яўляецца галоўным урачом дзіцячай паліклінікі Гродна, дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і кіраўніком Гродзенскага гарадскога ГА "Беларускі саюз жанчын", са студэнтамі Гродзенскага прафесійнага хіміка-тэхналагічнага каледжа ў актавай зале сабралася больш за 160 навучэнцаў. Сустрэчу арганізавала кіраўніцтва каледжа. Вольга Карпенка, намеснік дырэктара каледжа, якая з'яўляецца старшынёй УВК № 24 і іншыя сябры УВК (завучы і выкладчыкі каледжа) адзначалі прысутнасць навучэнцаў па спісах.

1 лістапада такая ж сустрэча адбылася ў Гродзенскім прафесійным каледжы будаўнікоў. Дырэктар каледжа Алена Жалезняковіч, якая з'яўляецца старшынёй УВК № 26, разам з іншымі работнікамі, сябрамі той жа УВК, таксама дапамагалі ў арганізацыі сустрэчы і сачылі за яўкай навучэнцаў.

Адзначаны выпадкі стварэння перашкодаў для некаторых кандыдатаў у дэпутаты. Так, кандыдат ад Беларускай партыі "Зялёныя" па Гродзенскай-Занёманскай ВА № 49 Жанна Гасцяева паведаміла аб перашкодах пры сустрэчы з выбарцамі ў сярэдняй школе № 20. АВК не праінфармавала выбарцаў аб правядзенні сустрэчы на інтэрнэт-сайце гарвыканкаму альбо іншым спосабам. На сайце Гродзенскага гарвыканкама была пададзеная недакладная інфармацыя пра плануемую сустрэчу, у прыватнасці, не пазначаны адрас школы. Акрамя таго, работнікі школы не былі праінфармаваны пра выбарчае мерапрыемства.

## НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІЯЙ

Цэнтральная камісія апублікавала звесткі аб назіральніках, акрэдытаваных Цэнтральнай, тэрытарыяльнымі, акруговымі і ўчастковымі выбарчымі камісіямі па стану на 28 кастрычніка[1]. Абсалютнымі лідэрамі з'яўляюцца праўрадавыя ГА: прафесійныя саюзы, БРСМ, Белая русь і Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Па стане на 31 кастрычніка ЦВК акрэдытавала 459 замежных назіральнікаў, з іх 367 назіральнікаў СНД (каля 80% ад агульнай колькасці акрэдытаваных міжнародных назіральнікаў), 50 назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ, 28 назіральнікаў Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы і 14 ад выбарчых органаў замежных дзяржаў[2].

---

[1] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat8.pdf

[2] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/int_obs.pdf

## АДМЕНА РЭГІСТРАЦЫІ КАНДЫДАТАМІ У ДЭПУТАТЫ

Паводле дадзеных ЦВК на 31 кастрычніка[3], колькасць кандыдатаў у дэпутаты зменшылася з 560 да 531, што на 29 чалавек менш, чым было зарэгістравана першапачаткова. Дзевяці кандыдатам выбарчыя камісіі адмянілі рэгістрацыю з-за парушэнняў парадку вядзення перадвыбарчай агітацыі (арт. 47 ВК, які забараняе ў тым ліку заклікі да звяржэння канстытуцыйнага ладу, абразы вышэйшых службовых асобаў і інш.), 20 чалавек знялі сваю кандыдатуру добраахвотна. ЦВК папярэджвае, што факты выпуску і распаўсюджвання кандыдатамі і іх даверанымі асобамі неўсталяванай друкаванай прадукцыі і пікеты, праведзеныя з парушэннем закона, атрымаюць належную прававую ацэнку.

29 кастрычніка АВК Бабруйскай-Першамайскай ВА № 79 адмяніла рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Арсеня Чыгіра. Падставай для адмены рэгістрацыі паслужыла непрадстаўленне кандыдатам у АВК у двухдзённы тэрмін інфармацыі аб адкрыцці спецыяльнага выбарчага рахунка, а таксама наяўнасць ужо вынесенага папярэджання “за парушэнне парадку вызвалення ад выканання працоўных абавязкаў для ўдзелу ў правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў”. Дадзенае рашэнне кандыдат у дэпутаты абскардзіў у Магілёўскую АВК.

1 лістапада АВК Брэсцкай-Памежнай ВА № 4 прыняла рашэнне аб скасаванні рэгістрацыі незалежнага кандыдата, працівніка будаўніцтва завода АКБ Уладзіміра Мароза. Падставай для адмены рэгістрацыі, па словах старшыні АВК Надзеі Зайцавай, з’явіліся шматлікія факты парушэння правілаў вядзення перадвыбарчай агітацыі, у прыватнасці, неадпаведнасць працэдуры асобных прадстаўленных у АВК дакументаў, размяшчэнне ў перадвыбарчай праграме “інфармацыі, якая ганьбіць гонар дзяржаўных органаў і судовай сістэмы”, распаўсюджванне агітацыйных матэрыялаў без выходных дадзеных і размяшчэнне ў іх “заклікаў да змены ўлады”.

## ЦЭНЗУРА ВЫСТУПАЎ КАНДЫДАТАЎ

Зафіксаваны факты адмоў у публікацыі перадвыбарчых праграм і трансляцыі выступленняў кандыдатаў у дэпутаты. Афіцыйнай прычынай, як правіла, служаць “прыкметы парушэння артыкула 47 Выбарчага Кодэксу Рэспублікі Беларусь”. Так, газета “Звязда” адмовіла кандыдатцы ад АГП па Мінскай-Каменнагорскай ВА № 101 Дзіяне Чарнушынай, выявіўшы ў яе праграме прыкметы “абразы і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь”. 30 кастрычніка не выйшаў у эфір на тэлеканале “Беларусь-3” выступ Мікалая Маслоўскага, які балатуецца ў дэпутаты па Кальварыйскай акрузе № 104. Прэс-служба БХД паведаміла пра факты ўмяшальніцтва з боку вядучага тэлерадыёкампаніі **“**Беларусь-3**”** у запіс афіцыйных тэледэбатаў кандыдатаў па Чкалаўскай ВА № 96 г. Мінска.

Тэлерадыёкампанія “Гродна” не пусціла ў эфір відэаролік кандыдата ад АГП па Іўеўскай ВА № 54 Ірыны Давідовіч. 30 кастрычніка адбылося пасяджэнне АВК, на якім разглядалася пытанне пра размяшчэнне Ірынай Давідовіч у сваіх сацыяльных

---

[3] Даступна на: https://www.belta.by/politics/view/chislo-kandidatov-v-deputaty-v-belarusi-umenshilos-do-531-367643-2019/

сетках відэароліка з тэлевыступам для Гарадзенскага тэлебачання. У выніку АВК абвясціла Ірыне Давідовіч папярэджанне "у сувязі з парушэннем парадку правядзення передвыбарчай агітацыі".

Тэлеканал **"**Беларусь-3**"** зняў з эфіру перадвыбарчы выступ актывіста "Еўрапейскай Беларусі", кандыдата ад партыі БНФ па Светлагорскай ВА №46 Дзмітрыя Савіча.

Кандыдат ад АГП Мікалай Маслоўскі зафіксаваў парушэнні выбарчага заканадаўства з боку сваіх канкурэнтаў па Кальварыйскай ВА № 104 і факты правакацыйнага характару ў адносінах да яго асобы. Аднак належнай ацэнкі з боку акруговай камісіі гэтыя факты пакуль не атрымалі.

На думку экспертаў кампаніі, змест арт. 47 ВК трактуецца празмерна шырока, што вядзе да абмежавання свабоды перадвыбарчага выступу кандыдата ў дэпутаты і носіць характар цэнзуры.

Выбарчым камісіям відавочна бракуе прававых ведаў для адэкватнага прымянення арт. 47 ВК, што прыводзіць да адвольнага прымянення санкцый да асобных кандыдатаў у дэпутаты і адмены іх рэгістрацыі. Нават пры наяўнасці механізма абскарджвання такая практыка празмерна абмяжоўвае іх права на вядзенне перадвыбарчай агітацыі, таму што абскарджванне рашэння выбарчай камісіі не прыпыняе рашэнне аб адмене рэгістрацыі і не дазваляе праводзіць агітацыю.

Варта нагадаць, што згодна з артыкулам 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах кожны мае права на свабоднае выказванне свайго меркавання. Дадзенае права можа быць абмежавана згодна з законам і толькі для павагі правоў і рэпутацыі іншых асобаў альбо для аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя ці маралі насельніцтва.

30 кастрычніка адбылося пасяджэнне Назіральнага савета па кантролю за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў СМІ, на якім разглядаліся тры скаргі кандыдатаў у дэпутаты, выступы якіх не пусцілі ў эфір. Ні адна скарга не была задаволеная. Як адзначана ў паведамленні ЦВК, "сябрамі Назіральнага савета большасцю галасоў скаргі былі прызнаныя неабгрунтаванымі"[4]. Абгрунтавання прынятага рашэння ў паведамленні ЦВК не прыводзіцца.

## ИНФАРМАЦЫЯ АБ ВЫБАРЧЫХ ФОНДАХ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ

Згодна з пунктам 3.8 пастановы ЦВК ад 06.08.2019 № 27 "Аб інфармаванні грамадзян аб працы па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў" у рубрыцы "ВЫБАРЫ-2019" на сайтах мясцовых выканкамаў павінна размяшчацца, у тым ліку, інфармацыя аб агульных сумах сродкаў, якія паступілі на спецыяльныя выбарчыя рахункі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, і агульных сумах выкарыстаных сродкаў. Дадзеныя звесткі павінны размяшчацца штотыдзень пасля паступлення ў акруговую выбарчую камісію, размешчаную на адпаведнай тэрыторыі, інфармацыі з падраздзялення банка. Аналіз старонак Інтэрнэт-сайтаў

[4] Дастýпна на: http://rec.gov.by/ru/novosti/30-10-2019-zasedanie-nablyudatelnogo-soveta

мясцовых выканкамаў, прысвечаных выбарчай кампаніі, паказаў, што дадзенае патрабаванне не выконваецца ў поўнай меры.

На сайтах адміністрацый раёнаў г. Мінска адсутнічае адзіны падыход па размяшчэнні інфармацыі, прадугледжанай пунктам 3.8 пастановы ЦВК № 27. Так, адміністрацыя Ленінскага раёна г. Мінска апублікавала толькі паведамленні аб адкрыцці спецыяльных выбарчых рахункаў кандытамі ў дэпутаты па размешчаных на тэрыторыі раёна выбарчых акругах, але звестак пра паступленне і выдаткоўванне сродкаў выбарчых фондаў няма.

Такая ж сітуацыя з інфармацыяй аб выбарчых фондах і на сайце адміністрацыі Савецкага раёна г. Мінска. Па Коласаўскай ВА № 106 размешчаная інфармацыя, што ўсе шэсць кандыдатаў адкрылі спецыяльныя рахункі. Па Усходняй ВА № 107 – пяць з сямі. Інфармацыю аб руху сродкаў кандыдатаў адміністрацыя не публікуе.

Сайт адміністрацыі Фрунзенскага раёна публікуе інфармацыю выбарачна. На тэрыторыі раёна знаходзяцца 4 выбарчыя акругі. Па Пушкінскай ВА № 103 няма ніякай інфармацыі пра выбарчыя фонды кандыдатаў. У той жа час па Заходняй ВА № 102, Кальварыйскай ВА № 104 і Каменнагорскай ВА № 107 ёсць інфармацыя і аб адкрыцці спецыяльных выбарчых рахункаў кандыдатамі, і звесткі аб руху сродкаў кандыдатаў.

На сайце Смаргонскага райвыканкама даецца спасылка на адпаведную старонку сайта Беларусбанка, дзе размешчана інфармацыя аб спецыяльных выбарчых рахунках усіх кандадытаў у дэпутаты па краіне. Інфармацыі аб выдаткаванні сродкаў з выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты на сайце выканкама няма. Такая ж сітуацыя на сайце Віцебскага гарвыканкама, Докшыцкага, Глыбокскага райвыканкамаў і іншых.

На сайтах Светлагорскага, Бабруйскага, Мазырскага, Аршанскага, Салігорскага райвыканкамаў размешчана інфармацыя толькі аб адкрыцці выбарчах рахункаў кандыдатамі ў дэпутаты, інфармацыя аб руху сродкаў адсутнічае.

## РАЗГЛЯД ВЫБАРЧЫХ СПРЭЧАК, АБСКАРДЖАННЕ

31 кастрычніка на пасяджэнні ЦВК была разгледжана скарга кандыдата ў дэпутаты па Брэсцкай-Усходняй ВА № 3 Уладзіслава Сысы на рашэнне Брэсцкай АВК ад 21 кастрычніка 2019 г. № 15 аб адмене рашэння АВК аб рэгістрацыі яго кандыдатам у дэпутаты. Рашэнне было прынята па выніках праверкі матэрыялаў аб яго рэгістрацыі, праведзенай Брэсцкай абласной ВК. Як адзначана ў рашэнні, “акруговай выбарчай камісіяй пры прыняцці рашэння аб рэгістрацыі не ўлічана, што Уладзіслаў Сыса не пражывае пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь, паколькі з’яўляецца студэнтам стацыянарнай формы навучання Варшаўскага ўніверсітэта, у сувязі з чым пражывае ў Варшаве (Рэспубліка Польшча). Факт пражываня за межамі Беларусі падцвярджаецца таксама тлумачэннямі У.Д. Сыса у інтэрвью Еўрадыё”[5].

Разгледзеўшчы скаргу, ЦВК пакінуў яе без задавальнення. ЦВК прызнала, што Сыса не мог быць зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты, паколькі не адпавядае

---

[5] Даступна на: http://brest-region.gov.by/attachments/article/10102/10102-9.pdf

патрабаванням ч. 2 арт. 57 ВК, які прадугледжвае, што дэпутатам Палаты прадстаўнікоў можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года і пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь.

На пасяджэнні ЦВК загадчыца аддзела прававой, аналітычнай і метадычнай працы Галіна Мкртчан адзначыла, што пры вызначэнні факта пастаяннага пражывання трэба кіравацца арт. 19 ГК. Згодна з ім месцам жыхарства грамадзяніна прызнаецца месца знаходжання (адрас) жылога памяшкання, права валодання, распараджэння і (або) карыстання якім узнікла ў грамадзяніна па падставах, устаноўленых заканадаўчымі актамі, або населены пункт, дзе гэты грамадзянін стала або пераважна пражывае. Але дадзеная норма, па нашаму меркаванню, не перашкаджае Уладзіславу Сыса ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі ў якасці кандыдата ў дэпутаты, паколькі гэты кандыдат у дэпутаты мае сталую рэгістрацыю ў Беларусі.

Варта адзначыць, што ў 2001 г. Канстытуцыйны Суд па запыце ЦВК 15 чэрвеня 2001г. прыняў рашэнне № Р-120/2001 “Аб прававой пазіцыі Канстытуцыйнага Суда адносна выкарыстоўваемага ў артыкуле 80 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь паняцця “грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь”. Названым рашэннем пастаноўлена, што пры вызначэнні месца сталага пражывання трэба ўлічваць не толькі месца фактычнага знаходжання асобы ў той ці іншы перыяд часу (у Рэспубліцы Беларусь альбо за яе межамі), але і яго намер мець дадзенае месца ў якасці месца свайго пастаяннага пражывання. Змест гэтага паняцця прадвызначаецца мэтамі выезду (выбыцця) за межы Рэспублікі Беларусь: ці з'яўляецца выезд часовым або гэта выбыццё на пастаяннае месца жыхарства ў іншую дзяржаву. У карысць часовага характару знаходжання за межамі Рэспублікі Беларусь і захаванні Рэспублікі Беларусь у якасці месца пастаяннага пражывання, на думку КС, сведчаць такія абставіны, як захаванне грамадзянства, адсутнасць афармленага выезду на пастаяннае месца жыхарства ў іншую дзяржаву, атрыманне прытулку ў замежнай дзяржаве. Таму, на думку аналітыкаў кампаніі **“**Праваабаронцы за свабодныя выбары**”**, у дадзеным выпадку не мелася падстаў адмаўляць у рэгістрацыі У.Д. Сыса.

Згодна з дадзенымі ЦВК[6], на адмовы ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі былі пададзены 62 скаргі, з якіх была задаволена толькі адна (менш за 2%), а 7 – былі пакінутыя без разгляду.

У суды на рашэнні тэрытарыяльных камісій аб адмове ў задавальненні скаргаў на рашэнні АВК аб адмове ў рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты былі пададзеныя 27 скаргаў, з якіх задаволена адна, дзве былі пакінуты без разгяду, па яшчэ адной было адмоўлена ва ўзбуджэнні справы.

[6] Даступна на: http://rec.gov.by/sites/default/files/pdf/2019/stat35.pdf